

*Рис. 5.* Традиционные белорусские головные уборы из бумаги

УДК 398.8(476)

**І. В. Мазюк,**
*дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», член Беларускага саюза музычных дзеячаў, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## СПЕЦЫФІЧНАЯ ВАКАЛЬНАЯ АРТЫКУЛЯЦЫЯ ЯК АСНОВА БЕЛАРУСКАГА ТРАДЫЦЫЙНАГА СПЕЎНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

**Анатацыя.** *На музычна-этнаграфічным матэрыяле палявых экспедыцый і на базе ўласнага вопыту практычнага даследавання спеўнай культуры Беларусі аўтарам разглядаюцца асаблівасці тэмбраўтварэння і спеўнай артыкуляцыі розных лакальных выканальніцкіх традыцый краіны.*

**Ключавыя словы:** *спеўная культура, спеўнае выканальніцтва, артыкуляцыя, тэмбр.*

**I. Maziuk,**
*associate Professor of the Department of Decorative and Applied Arts and Costume of the Educational Institution "Belarusian State Academy of Arts", member of the Belarusian Union of Musicians, Minsk, Republic of Belarus*

# SPECIFIC VOCAL ARTICULATION AS THE BASIS OF BELARUSIAN TRADITIONAL SINGING PERFORMANCE

**Abstract**. *Based on the musical and ethnographic material of field expeditions and on the basis of authors experience of practical research of the singing culture of Belarus, the author examines the features of timbre formation and singing articulation of various local performing traditions of the country.*

**Key words**: *singing culture, singing performance, articulation, timbre.*

Спіс Нацыянальнага інвентару нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі ўтрымлівае 8 аб'ектаў спеўна-выканальніцкай культуры розных рэгіёнаў краіны. Адзін з іх прадугледжвае ахову традыцыі выканання песень каляндарна-абрадавага цыкла, два – сямейна-абрадавага, 5 – ахопліваюць мясцовы стыль выканання ўсяго комплексу традыцыйных песень. У Спіс інвентару НКС занесены не менш як 18 аб'ектаў, звязаных з культурай правядзення каляндарных ці сямейных абрадаў, цэнтральным элементам якіх з'яўляецца песня ці цэлы іх комплекс, што ўваходзяць у структуру абраду, абавязковыя пры яго правядзенні. Адной з умоў уключэння элементаў НКС у Спіс з'яўляецца пераемнасць традыцый. Для паспяховага яе забеспячэння важна, які лёс чакае выканальніцкае мастацтва, яго аўтэнтычныя формы, ці не існуе неспадзяваных пагроз якаснай трансляцыі элементаў культурнага комплексу на ўзроўні тэхнікі выканання. У межах артыкула закранаюцца пытанні вывучэння беларускага традыцыйнага спеўна-выканальніцкага мастацтва, пошуку шляхоў перадачы гэтай каштоўнай спадчыны.

Песня як з'ява культуры складаецца з тэксту як паэтычнага твора, мелодыі, якая мае пэўную ладава-рытмічную пабудову. Працэс яе выкання прадугледжвае цэлы комплекс спецыфічных спеўна-выканальніцкіх элементаў: тэмбр, артыкуляцыйныя навыкі, голасавядзенне, рэзаніраванне, дынамічныя характарыстыкі, псіхаэмацыянальнае пражыванне зместаў (паэтычнага, сюжэтнага, мелодыка-інтанацыйнага). Любой спеўнай культуры ўласціва пэўная, толькі ёй характэрная спецыфіка работы т. зв. галасавога «біяінструмента» спевака ў працэсе выканання музычнага тэксту. Гэта тычыцца як сучасных вакальных школ, так і кожнай з аўтэнтычных народных спеўных культур. Этнічны спеў таго ці іншага народа мы адрозніваем, не ведаючы мовы, на слых, па своеасаблівым каларыце. Тэмбр голасу спевака, спецыфічная вакальная артыкуляцыя – гэтыя важнейшыя выяўленчыя сродкі любога этнічнага спеўнага выканальніцкага мастацтва, якія фарміруюць непаўторны вобраз, што выяўляе так званы этнічны гукаідэал – той спосаб сольнага і гуртавога гучання, які лічыцца найбольш прыгожым у дадзенай культуры.

Спеўна-выканальніцкі ландшафт Беларусі неаднародны, у мностве лакальных варыянтаў назіраюцца ўстойлівыя рэгіянальныя асаблівасці, многія з якіх даўно і пасляхова вывучаюцца музыказнаўцамі. З усяго масіву даследчыкі вылучаюць найбольш выразныя стылі гуртавога спеву: унісоннае аднагалоссе, унісонна-гетэрафонны стыль, дыяфонію, дыяфонію на элементах бурданіравання, двухгалоссе, шматгалоссе.

Адзін з важнейшых стылеўтвараючых сродкаў выканальніцкага комплексу – спеўная артыкуляцыя, аднак, не атрымала належнай увагі. Прычынай з'яўляецца тое, што складана назіраць, дакладна апісаць ці графічна зафіксаваць асаблівасці працы галасавога «інструмента» выканаўцы падчас спеву дзеля навуковага аналізу; пакуль не распрацавана сістэма сімвалічнага выяўлення ключавых выканальніцкіх элементаў пры трансфармацыі спеву ў пісьмовы тэкст шляхам натавання.

Вывучэнне артыкуляцыі можна здзяйсняць з пазіцый практыка-вакаліста. Інструментам даследавання можа паслужыць развіты прафесійны слых як механізм назірання і ацэнкі спеву як працэсу ў яго біяакустычнай, інструментальнай прыродзе. Вакальны слых – гэта магчымасць успрымаць і аналізаваць біямеханічныя і акустычныя працэсы ў галасавым «інструменце» падчас спеву, перамяшчэнне і пластыку спеўнай плыні. Гэта здольнасць – вынік прафесійнага развіцця вакаліста, яго ўласнага вопыту гучання і ўспрымання спеву іншага чалавека. Яна таксама ўласціва некаторым людзям, якія не займаюцца музыкай, але атрымалі дар ад прыроды. Настроіўшы адпаведным чынам увагу, з дапамогай закладзенага ў кожным чалавеку ідэаматорнага механізма распазнавання як мовы, так і спеву, прапануем па-новаму паслухаць спеў аўтэнтычных выканаўцаў.

Абапіраючыся на магчымасці вакальнага слыху, з усёй разнастайнасці лакальных стылявых варыянтаў можна выдзеліць два тыпы беларускіх спеўных традыцый з пазіцый ацэнкі выканальніцкай тэхнікі, адрозных па спосабе спеўнага артыкулявання. Гэтае адрозненне палягае ў спецыфіцы выкарыстання рэгістравай прыроды спеву. Адзін з іх выразна і заўсёды грудны, другі – галаўны.

У якасці прыкладу спеву ў грудным рэгістры прапануем выкананне жніўнай песні «Ой я жала, не ляжала» гуртом з в. Велута Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Запіс зроблены аўтарам у 2001 г. Паводле стылю выканання песню можна аднесці да дыяфоніі на элементах бурданіравання. Дысанатыўнае ўзаемадзеянне тэмбраў галасоў у ніжнім дыяпазоне груднога рэгістра асноўнай групы спявачак і саліруючага голасу ў верхнім ствараюць неверагодна прыгожы акустычны эфект. Калі ахарактарызаваць працэс успрымання гетэрафоннага спявання «знутры», з пазіцыі спявачак, то ўзаемадзеянне ў сурэзаніраванні, вострая сугучнасць галасоў, галаграфічная прыгажосць тэмбральных супадзенняў і разыходжанняў паміж гукамі дазваляюць перажыць асаблівую эстэтычную асалоду ад спявання ў гэтым стылі, распаўсюджаным пераважна на Цэнтральным Палессі.

Спеў у галаўным рэгістры праілюструем прыкладам выканання веснавой песні «Ой пагнала дзеўка валы ў дуброву», запісанай М. Козенкам у 1989 г. у в. Белая Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Спеў гучыць у верхнім рэгістры, на мяжы галасавых магчымасцей. Такое гучанне заснавана на іншых эмоцыях, перажываннях, большым (ці іншым) фізічным напружанні, прыносіць сваё адмысловае катарсічнае задавальненне ад працэсу спявання. Падобны стыль выканання ў сваіх інварыянтах з’яўляецца дамінуючым ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі.

Прыведзеныя прыклады спеву выключна ў адным з рэгістраў могуць ахарактарызаваць толькі асобныя з рэгіянальных ці лакальных традыцый. Чалавечы галасавы «інструмент» – гэта вельмі складаная біяакустычная сістэма, якая дазваляе ўтвараць самыя розныя гукі ў безлічы міксбавых (змешаных па рэгістравых прыкметах) варыянтах, што абумоўлівае стылявую разнастайнасць беларускай спеўнай культуры. Беларускія этнамузыколагі З. Мажэйка і Т. Варфаламеева выдзяляюць на тэрыторыі краіны 22 адметныя самабытныя зоны спеўных традыцый.

Назіраючы за рэгістравай прыродай спеву, можна заўважыць самыя розныя варыянты спалучэння прыродных тэмбраў выканальніц у гуртавых спевах. Для ілюстрацыі прапануем песню, дзе арганічна спалучаюцца галасы, якія гучаць у грудным рэгістры і ў міксбавым рэжыме – «Як на Йвана на Купала» ў выкананні Еўтух Сафіі, 1935 г. н. і Савіловіч Надзеі 1935 г. н. з в. Лунін Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, запісаную аўтарам у 2007 г. Н. Савіловіч, якая запявае, вядзе голас у ніжнім рэгістры, а С. Еўтух спявае ў змешаным рэжыме. Пры гэтым дуэт мае паўнавартаснае гучанне ў характэрным для мясцовай традыцыі спеву гетэрафанічным стылі.

Адной з самых важных асаблівасцей тэхнікі спеву і ключавым тэхнічным вакальным прыёмам большасці лакальных выканальніцкіх традыцый Беларусі з’яўляецца спецыфічная тэхніка рэгістравых пераходаў гуку пры змене яго вышыні адпаведна мелодыі. У якасці прыкладу – сольнае выкананне жніўнай песні «Дайце жы мого пов’язнычка», спявае Ганна Калешка, 1928 г. н., в. Вулька-1, Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці. Дамінуючыя прыкметы спеўных фармантаў актыўна перамяшчаюцца ў галасавым «інструменце» па вертыкалі ўслед за зменамі гукавышыні. Пры гэтым даволі часта гэтыя пераходы чутныя вельмі выразна, у некаторых выпадках яны складаюць частку мелодыі, іх нельга выключыць з выканальніцкага працэсу без пашкоджання цэласнасці песні. Чым вышэй вопыт і майстэрства спевака, тым больш мабільна гук перамяшчаецца з адной пазіцыі ў іншую. Разглядаемыя рэгістравыя пераходы забяспечваюцца адпаведнымі рухамі гартані, якія рэгулююць доступ галасавой плыні да ніжніх рэзанатараў.

Спеўныя гукі, якія ўтвараюцца на ніжніх ступенях мелодыі, можна ахарактарызаваць як даволі адкрытыя, галасавы «інструмент» мае

абмежаваныя магчымасці мадэляваць форму гуку. Гэта вельмі часта прыводзіць да рэдуцыравання галосных на карысць паніжэння пазіцыі спеўнага гучання. У верхнім дыяпазоне голас больш пластычны, разнастайны па форме. Гэта звязана з магчымасцю ўплываць на спеўнае гучанне праз выкарыстанне ўсяго комплексу рэзанатараў, што забяспечваецца высокаскаардынаванай работай унутранай мускулатуры галасавога «інструмента».

Артыкуляцыйныя асаблівасці спеўнага выканальніцтва важныя як з пункту гледжання эстэтыкі, так і «інструментальнай» мэтазгоднасці выканальніцкага працэсу. Вывучэнне асаблівасцей тэхнікі выканання традыцыйных песень дазволіць забяспечыць пераемнасць, захаваць стылявыя адрозненні розных рэгіянальных і лакальных традыцый беларускай спеўнай культуры.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 287 с.

2. *Емельянов, В. В.* Развитие голоса. Координация и тренинг / В. В. Емельянов. – СПб. : Лань, 1997. – 190 с.

3. *Мазюк, І. В.* Некаторыя асаблівасці артыкулявання ў традыцыйным спеўным выканальніцтве / І. В. Мазюк // Весн. Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. – 2003. – № 1. – С. 92.

4. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер’я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.

5. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – Вып. 2. – М. : Сов. композитор, 1984. – 151 с.

6. *Можейко, З. Я.* Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура в свете социально-экологических проблем / З. Я. Можейко. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с. : ил., ноты.

7. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 392 с.